# ДОБРЫ ДЗЕНЬ, УНІВЕРСІТЭТ!

*Фотарэпартаж з пасвячэння першакурснікаў у студэнты*

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 25 (474) | Субота, 5 верасня 1981 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.



Першыя студэнцкія білеты — медалістам.



Запальваецца «Чаша ведаў».



«Ключ ведаў» — у руках Святланы Сцепаненка.



Клятву першакурснікаў зачытвае Людміла Кравец з эканамічнага факультэта.



Аб пачатку навучальнага года абвяшчае першы званок.

ПЕРШАГА верасня перад табой, першакурснік, гасцінна расчыніліся дзверы вядучай навучальнай установы Беларускага Палесся, дзе ты толькі што здаваў уступныя экзамены і вытрымаў іх з поспехам. Па добрай традыцыі ў першы дзень навучальнага года цябе ўрачыста пасвяцілі ў студэнты — прынялі ў вялікую і дружную універсітэцкую сям'ю.

...З хваляваннем і радасцю сабраліся ў мінулы аўторак каля першага корпуса універсітэта 725 юнакоў і дзяўчат — учарашніх школьнікаў і тых, хто прайшоў ужо пэўную жыццёвую школу. На ўрачыстае пасвячэнне іх у студэнты прыйшлі дэканы факультэтаў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый ГДУ і горада, выкладчыкі, студэнты старэйшых курсаў.

Пад гукі ўрачыстага марша сцяг ГДУ ўносіць кавалер ордэна Леніна доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар Ф. М. Харытановіч, сцяг камсамольскай арганізацыі універсітэта — дэпутат Савета народных дэпутатаў Цэнтральнага раёна г. Гомеля, студэнт 5-га курса фізічнага факультэта Вячаслаў Сцяпура, Памятны сцяг ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР за шматгадовы актыўны ўдзел у будаўніцтве і меліярацыі зямель, поспехі ў вучобе і грамадска-палітычным жыцці — кавалер ордэна «Знак Пашаны» сакратар камітэта камсамола эканамічнага факультэта Вячаслаў Асіпенка, сцяг студэнцкага спартыўнага таварыства «Буравеснік» — пераможца сацыялістычнага спаборніцтва сярод трэнераў універсітэта, ударнік камуністычнай працы, трэнер жаночай каманды па ручному мячу, якая стала ўладальніцай кубка БССР, кубка спартыўных клубаў ВНУ краіны, старшы выкладчык факультэта фізвыхавання В. П. Крукоўскі.

Новае папаўненне студэнцкай сям'і універсітэта цёпла вітае доктар эканамічных навук, заслужаны работнік вышэйшай школы БССР прарэктар ГДУ па навуковай рабоце М. В. Навучыцель. Міхаіл Веніямінавіч віншуе юнакоў і дзяўчат з пачаткам новага этапу ў іх жыцці — часу настойлівага авалодвання ведамі, жадае ім быць заўсёды на быстрыні жыцця, выкарыстоўваць усе выдатныя магчымасці, якія дае для гарманічнага развіцця асобы універсітэт. Пад гарачыя апладысменты прысутных ён уручае студэнцкія білеты тым, хто паспяхова вытрымаў уступныя экзамены, апраўдаў званне медаліста.

По добрай традыцыі ў мемарыяльным скверы на плошчы Працы ад Вечнага агню каля магілы загінуўшых воінаў вядучыя спартсмены універсітэта даставілі факел, ад якога студэнт факультэта фізічнага выхавання, член зборнай каманды БССР па лёгкай атлетыцы С. Кузьмянок запальвае сімвалічную «Чашу ведаў».

Ад імя старшакурснікаў «віноўнікаў урачыстасці» віншуе ленінскі стыпендыят студэнт 4-га курса фізічнага факультэта Міхаіл Сергіенка і перадае сімвалічны «Ключ ведаў» першакурсніцы гістфіла Святлане Сцепаненка.

Пяцікурснік эканамічнага факультэта, ветэран студэнцкага будаўнічага руху Алег Дземідзенка, расказвае першакурснікам аб вялікім укладзе студэнцкіх атрадаў універсітэта ў выкананне народнагаспадарчых планаў, запрашае стаць іх у будучым актыўнымі ўдзельнікамі трэціх працоўных семестраў. Як эстафету добрых працоўных спраў, ён перадае студэнцкі Знак якасці студэнту 1-га курса экономфака камандзіру СБА «Шукальнік» Міхалаю Анціпчуку.

— Чалавек нараджаецца двойчы, — сказала ў сваім выступленні сакратар Гомельскага абкома камсамола В. М. Галавач. — Другі раз тады, калі выбірае сабе прафесію. Настойліва авалодвайце ёю, каб потым з гонарам апраўдваць званне высокакваліфікаванага спецыяліста, —звяртаецца камсамольскі важак да першакурснікаў.

Святлана Сцепаненка, якая выступіла ад імя ўсіх першакурснікаў, запэўніла, што яны будуць старацца працягваць і памнажаць лепшыя традыцыі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

Урачыста зачытваецца клятва першакурсніка. Выпускнік ГДУ Ігар Семчанка дае першы універсітэцкі званок. З гэтага дня ўчарашнія абітурыенты — паўнапраўныя члены вялікай студэнцкай сям'і універсітэта. Няхай жа пяць гадоў вучобы, якія хутка праляцяць, стануць для іх гадамі самазацвярджэння, сталасці. Вялікіх вам поспехаў, рабяты, на шляху авалодвання абранай прафесіяй.

**Т. ДУБЯК.**

Фота **У. Чысціка.**

## ПАЛЯПШАЦЬ ПРАФАРЫЕНТАЦЫЮ

Сёлета самы нізкі конкурс у нашым універсітэце быў на матэматычным факультэце. Гэта стала прадметам сур'ёзнага абмеркавання на адкрытым партыйным сходзе, на якім выступіў з дакладам намеснік дэкана матфака дацэнт М. В. Селькін. Указаўшы на аб'ектыўныя прычыны не высокага прытоку абітурыентаў на факультэт, ён гаварыў аб яшчэ недастатковай рабоце выкладчыкаў кафедр факультэта па прафарыентацыі школьнікаў, адбору і рэкамендацыі на вучобу ў ГДУ найбольш здольных у матэматыцы юнакоў і дзяўчат.

Пытанні аб выніках набору студэнтаў на новы навучальны год і паляпшэння прафарыентацыі школьнікаў абмеркаваны на партыйных сходах і іншых факультэцкіх партыйных арганізацый.

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

31 жніўня адбылося першае ў бягучым навучальным годзе пасяджэнне Савета універсітэта. Па дакладах прарэктара па АГР М. Д. Рычкова, загадчыцы бібліятэкі В. М. Касцючэнкавай і загадчыцы вучэбнага аддзела Н. І. Папковай заслухана пытанне аб гатоўнасці універсітэта да новага навучальнага года.

Прарэктар па вучэбнай рабоце Л. А. Шамяткоў выступіў з паведамленнем аб прадстаўленні студэнтаў да назначэння ім на першы семестр бягучага навучальнага года імянных стыпендый. Ленінскія стыпендыі назначаны чацвёртакурснікам Г. Байкачову і Н. Асмалоўскай з матэматычнага, А. Гайдуковай з гісторыка-філалагічнага, А. Нікіфараву з эканамічнага і М. Сергіенку з фізічнага факультэтаў, пяцікурснікам І. Каваленка з эканамічнага і Л. Медзінай з біялагічнага факультэтаў. Стыпендыя імя Янкі Купалы назначана пяцікурсніцы гістфіла А. Сулейка.

З інфармацыяй аб удзеле студэнтаў у асенніх сельскагаспадарчых работах выступіў сакратар камітэта камсамола В. М. Талсташоў.

На займаемыя і вакантныя пасады перавыбраны і выбраны прафесарска-выкладчыцкі састаў.

## *ВІНШУЕМ!*

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат факультэта фізвыхавання і кафедра фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны горача віншуюць выкладчыка гэтай кафедры СЯМЁНАВА Сяргея Пятровіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.**

# СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ — АКТЫЎНУЮ ДАПАМОГУ

З мэтай актыўнага прыцягнення студэнтаў і навучэн-
цаў да практычнага выканання рашэнняў XXVI з'езда
КПСС, XXIX з'езда КПБ, заданняў адзінаццатай пяці-
годкі, павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчай
дукцыі, скарачэння тэрмінаў і паляпшэння якасці уборкі
ўраджаю бюро Гомельскага абкома ЛКСМ Беларусі, прэ-
зідыум абласнога Савета прафсаюзаў, аб'яднанне «Го-
мельаблгароднінапрам», трэст па нарыхтоўцы кармоў
для жывёлы, абласное ўпраўленне сельскай гаспадаркі,
трэст па племяннной справе і кіраўніцтву племяннымі саў-
гасамі, аб'яднанне «Аблсортнасенпрам», аб'яднанне «Абл-
свінпрам», аб'яднанне «Сортнасенгародніна» прынялі па-
станову аб штогадовым правядзенні ў верасні — каст-
рычніку абласнога агляду студэнцкіх атрадаў, якія пра-
цуюць на ўборцы і нарыхтоўцы сельскагаспадарчай пра-
дукцыі.

## УМОВЫ

### АБЛАСНОГА АГЛЯДУ АТРАДАЎ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ НА ЎБОРЦЫ І НАРЫХТОЎЦЫ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ПРАДУКЦЫІ

1. У абласным аглядзе прымаюць удзел раённыя, занальныя і лінейныя студэнцкія атрады, камсамольскія арганізацыі навучальных устаноў, якія фарміруюць атрады.

2. Пераможцамі агляду лічацца занальныя, раённыя і лінейныя атрады, камсамольскія арганізацыі навучальных устаноў, якія дасягнуць лепшых вынікаў:

а) у павышэнні прадукцыйнасці працы, скарачэнні тэрмінаў і паляпшэнні якасці ўборкі ўраджаю;

б) у паспяховым выкананні і перавыкананні планаў нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі, прынятых сацыялістычных абавязацельстваў;

в) у арганізацыйнай рабоце ў падрыхтоўчы і рабочы перыяды;

г) у грамадска-палітычнай і ідэйна-выхаваўчай рабоце атрадаў у падрыхтоўчы і рабочы перыяды;

д) у медыка-санітарным забеспячэнні атрадаў;

е) у недапушчэнні выпадкаў цяжкага вытворчага і бытавога траўматызму, грубых парушэнняў дысцыпліны.

3. Пры падвядзенні вынікаў агляду не разглядваюцца матэрыялы занальных, раённых і лінейных атрадаў камсамольскіх арганізацый навучальных устаноў, дзе мелі месца факты траўматызму са смяротным зыходам, і атрадаў, якія працавалі не па прынцыпу СБА.

4. Камітэты камсамола навучальных устаноў, занальныя і раённыя штабы студэнцкіх атрадаў разглядаюць матэрыялы аб выніках работы атрадаў і па ўзгадненню з кіраўнікамі арганізацый, якія прымалі студэнтаў і вучняў, прадстаўляюць іх у абласны штаб студэнцкіх атрадаў абласнога камітэта ЛКСМ Беларусі да 15 кастрычніка.

5. Камсамольскія арганізацыі вышэйшых, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, ПТВ, якія занялі першае месца, узнагароджваюцца пераходнымі Чырвонымі сцягамі абкома камсамола і грашовай прэміяй у суме 200 рублёў, другое месца — пераходнымі вымпеламі абкома камсамола і грашовымі прэміямі ў суме 100 рублёў кожная, III месца — Ганаровымі граматамі абкома камсамола.

6. Раённы (занальны) студэнцкі атрад, які заняў першае месца, узнагароджваецца пераходным вымпелам абкома камсамола і грашовай прэміяй у суме 200 рублёў.

7. Сем лепшых лінейных студэнцкіх атрадаў, якія працавалі ў сістэме трэстаў, аб'яднанняў, узнагароджваюцца пераходнымі Чырвонымі сцягамі аб'яднанняў, трэстаў, упраўленняў і грашовымі прэміямі ў размеры 200 рублёў кожная.

8. Адзін лепшы студэнцкі атрад па ўсіх напрамках працы ўзнагароджваецца пераходным вымпелам абкома камсамола і грашовай прэміяй у размеры 300 рублёў.

9. Найбольш актыўныя ўдзельнікі і арганізатары асенніх студэнцкіх атрадаў прадстаўляюцца да ўзнагароджання Ганаровымі граматамі і Знакамі ЦК ВЛКСМ, Ганаровымі граматамі ЦК ЛКСМБ, абласнога камітэта ЛКСМБ, граматамі трэстаў, аб'яднанняў, упраўленняў, грашовымі прэміямі.

**Арганізацыйны камітэт абласнога агляду студэнцкіх атрадаў.**

## ЗВАРОТ ПЕРШАКУРСНІКАЎ ГРУПЫ Г-ІІ ГІСТОРЫКА-ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ДА ЎСІХ СТУДЭНТАЎ, АД'ЯЗДЖАЮЧЫХ НА СЕЛЬГАСРАБОТЫ

Савецкія людзі з вялікім энтузіязмам выконваюць гістарычныя рашэнні XXVI з'езда КПСС. Важныя задачы перад нашым народам пастаўлены ў галіне сельскай гаспадаркі. Вялікую працу ўклалі працаўнікі калгасаў і саўгасаў у тое, каб вырасціць і дагледзець ураджай гэтага года. Восень падвядзе вынік напружанай працы земляробаў, усіх працаўнікоў сельскагаспадарчай вытворчасці, якія, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы надвор'я, вырасцілі добры ўраджай. Таму сёння, як ніколі, патрабуецца ад земляробаў і ўсіх тых, хто звязаны з сельскагаспадарчай вытворчасцю, дысцыпліна, самаадданасць у рабоце. Неабходна ўбраць увесь ураджай да апошняга кілаграма. Задача не простая, але рэальная.

Вялікая роля ва ўборцы ўраджаю адводзіцца нашай моладзі. Студэнты, усе юнакі і дзяўчаты павінны прыкласці шмат энергіі, старання на ўборцы сельскагаспадарчай прадукцыі, унесці дастойны ўклад у выкананне планаў адзінаццатай пяцігодкі. Таму мы, студэнты групы Г-11 першага курса гісторыка-філалагічнага факультэта, бярэм на сябе павышаныя абавязацельствы:

— давесці дзённую норму выпрацоўкі на ўсіх відах работ да 140 працэнтаў;
— арганізаваць работу «Бюро добрых паслуг»;
— прачытаць перад насельніцтвам населеных пунктаў, дзе будзе размяшчацца наш атрад, 8 лекцый;
— падрыхтаваць да друку пяць матэрыялаў аб рабоце і грамадска-палітычнай дзейнасці атрада;
— выступіць з шасцю канцэртамі мастацкай самадзейнасці;
— падрыхтаваць дзесяць выпускаў насценных газет і «маланак»;
— аказаць шэфскую дапамогу сельскай школе, клубу і бібліятэцы;
— перадаць трыццаць кніг бібліятэцы сельскай школы;
— аказваць дапамогу ветэранам вайны і працы;
— правесці сустрэчы з ветэранамі вайны і працы;
— узяць часовае шэфства над помнікамі гісторыі;
— правесці паходы па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы;
— правесці мерапрыемствы з мясцовымі камсамольскімі арганізацыямі;
— пералічыць у Фонд салідарнасці з дзецьмі, моладдзю краін, якія змагаюцца супраць каланіялізму і расізму, сродкі, заробленыя 18 верасня;
— правесці тры суботнікі па ўборцы ўраджаю і нарыхтоўцы кармоў;
— правесці аперацыю «Салдацкія пісьмы».

Мы звяртаемся да ўсіх атрадаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, якія выехалі на сельскагаспадарчыя работы, з заклікам арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва за павышэнне прадукцыйнасці працы, скарачэнне тэрмінаў, высокую якасць уборкі ўраджаю, паспяховае выкананне і перавыкананне планаў і заданняў уборкі сельскагаспадарчай прадукцыі.

ЗВАРОТ ПРЫНЯТЫ НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ ГРУПЫ.

## НА ІНСТРУКЦЫЙНАЙ НАРАДЗЕ

2-га верасня ў актавай зале сабраліся дэканы, іх намеснікі, загадчыкі кафедр, кіраўнікі сельскагаспадарчых атрадаў, іншыя супрацоўнікі універсітэта, якія задзейнічаны ў падрыхтоўцы і правядзенні работы студэнтаў на ўборцы бульбы. Аб іх адказных абавязках і надзённых задачах, якія стаяць перад сельскагаспадарчай вытворчасцю ў сувязі з неспрыяльнымі кліматычнымі ўмовамі, гаварыў начальнік штаба па правядзенню сельскагаспадарчых работ прарэктар універсітэта прафесар М. В. Навучыцель.

На нарадзе былі заслуханы таксама інструкцыйныя выступленні сакратара камітэта камсамола Віталія Талсташова, яго намесніка Уладзіміра Кананкова, членаў штаба універсітэта па правядзенню сельгасработ А. А. Баскакава, А. А. Косцікава, інжынера па ахове працы і тэхніцы бяспекі М. С. Гамалеева, камандзіра Жыткавіцкага занальнага штаба па правядзенню сельскагаспадарчых работ выкладчыка Гомельскага кааператыўнага інстытута У. С. Ярышкіна, камісара гэтага штаба і адказнага за атрады універсітэта ў Петрыкаўскім раёне выкладчыка кафедры фізвыхавання В. З. Марчанкі.

Асноўная мэта нарады заключалася ў тым, каб забяспечыць высокую дысцыпліну, арганізаванасць і якасць у правядзенні ўсіх сельскагаспадарчых работ.

3-га верасня раніцай з Гомельскага чыгуначнага вакзала адправіўся ў спецыяльны рэйс цягнік, які даставіў у Петрыкаўскі і Жыткавіцкі раёны сельскагаспадарчыя атрады нашага універсітэта. Пасля вырашэння арганізацыйных пытанняў і размяшчэння па месцах дыслакацыі яны прыступілі да працы і на ўсіх участках аказваюць працаўнікам сельскай гаспадаркі вялікую дапамогу.

## АРГАНІЗАЦЫЙНА-ПАЛІТЫЧНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ

### ГОМЕЛЬСКАГА АБЛАСНОГА СТУДЭНЦКАГА АТРАДА НА ПЕРЫЯД АСЕННІХ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ РАБОТ 1981 ГОДА

— Мабілізацыя студэнтаў ВНУ, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ПТВ на актыўны ўдзел у рэалізацыі рашэнняў XXVI з'езда партыі, усенародную барацьбу за паспяховае выкананне і перавыкананне планаў 1981 года.

Арганізацыя ў атрадах спаборніцтва за павышэнне вытворчасці працы, скарачэнне тэрмінаў і паляпшэнне якасці ўборкі ўраджаю, паспяховае выкананне і перавыкананне планаў нарыхтоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі.

**(Увесь перыяд. Адказн. — занальныя і лінейныя штабы СА).**

— Укараненне ў атрадах прагрэсіўных форм арганізацыі працы, разгортванне руху за эканомію і ашчаднасць, стварэнне ў атрадах пастоў «Камсамольскага пражэктара» з мэтай строгага кантролю за якасцю ўборкі і забеспячэння захаванасці ўраджаю.

**(Увесь перыяд. Адказн. — лінейныя штабы СА).**

— Абласны рэйд пастоў «КП» па кантролю за забеспячэннем студэнцкіх атрадаў фронтам работ, стварэннем нармальных жыллёва-бытавых і бяспечных умоў працы.

**(Першы і трэці тыдзень работы атрадаў. Адказн. — абласны і занальныя штабы СА, абласны і раённыя штабы «Камсамольскага пражэктара»).**

— Правядзенне ў месцах дыслакацыі агітацыйна-прапагандысцкай, ваенна-патрыятычнай, культурна-масавай, шэфскай і спартыўнай работы.

Работа лектарскіх груп, шэфства над ветэранамі вайны, выступленні агітбрыгад, правядзенне тэматычных вечароў, вусных часопісаў, дыскатэк, арганізацыя спартыўных спаборніцтваў, аперацый «Памяць», «Салдацкае пісьмо».

**(Увесь перыяд. Адказн. — камандзіры і камісары лінейных студэнцкіх атрадаў).**

— Актыўнае выкарыстанне сродкаў масавай інфармацыі для шырокай прапаганды перадавога вопыту ўдзелу студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадаў ва ўборцы ўраджаю. Арганізацыя сустрэч студэнтаў і навучэнцаў з перадавікамі сельскагаспадарчай вытворчасці.

**(Райкомы камсамола, занальныя і лінейныя штабы СА).**

— Тыдзень тэхнікі бяспекі і санітарнага добраўпарадкавання студэнцкіх лагераў. Афармленне нагляднай агітацыі, устанаўленне флагштока, пастраенне ўрачыстай лінейкі.

**(Першы тыдзень. Адказн. — камандзіры і камісары).**

— Дзень ударнай працы ў фонд салідарнасці з дзецьмі, моладдзю краін, якія змагаюцца супраць каланіялізму і расізму.

**(18 верасня. Адказн. — лінейныя штабы СА).**

— Правядзенне ў студэнцкіх атрадах рэйда «Прырода» па ахове акаляючага асяроддзя ў месцах дыслакацыі.

**(Увесь перыяд. Адказн. — лінейныя штабы СА).**

— Правядзенне агляду-конкурсу сярод студэнцкіх атрадаў на лепшае комплекснае мастацкае афармленне лагера студэнцкага атрада.

**(19—22 верасня. Занальныя і лінейныя штабы СА).**

— Тыдзень славы герояў. Падвядзенне вынікаў ваенна-патрыятычнай работы студэнцкіх атрадаў. Адкрыццё помнікаў і мемарыяльных дошак, пабудаваных і ўстаноўленых удзельнікамі асенніх сельскагаспадарчых работ.

**(23—29 верасня. Адказн. — лінейныя штабы СА).**

— Правядзенне ва ўсіх лінейных студэнцкіх атрадах камсамольскіх сходаў па падвядзенню вынікаў асенніх сельскагаспадарчых работ.

**(За 1—2 дні да заканчэння работ).**

**Абласны штаб студэнцкіх атрадаў Гомельскага АК ЛКСМ Беларусі.**

*Першакурснікам на заметку*

# КРЫНІЦА ВЕДАЎ

**«Сучасная навука развіваецца ў многіх лабараторыях, часта з вельмі складаным і разнастайным абсталяваннем. Але ў кожным з навукова-даследчых інстытутаў і вышэйшых навучальных установах першай лабараторыяй з'яўляецца бібліятэка».**

**І. Г. ПЯТРОЎСКІ.**

Больш пяцідзесяці гадоў наша бібліятэка выконвае сваю галоўную задачу — усямерна садзейнічае вучэбнаму працэсу, навукова-даследчай і ідэйна-выхаваўчай рабоце. Бібліятэка ў 1930 годзе абслужыла першых чытачоў — студэнтаў і выкладчыкаў Гомельскага агра-педагагічнага інстытута. За прайшоўшыя гады супрацоўнікам бібліятэкі прышлося карпатліва фарміраваць кніжны фонд; эвакуіраваць бібліятэчную маёмасць у 1941 годзе ў горад Амутнінск Кіраўскай вобласці; аднаўляць работу ў Гомелі ў 1944 годзе; пераадольваць матэрыяльныя цяжкасці, аднаўляць фонд; удасканальваць і укараняць новыя формы і метады работы.

Зараз бібліятэка універсітэта з'яўляецца адной з буйнейшых у Гомельскай вобласці. Яе кніжны фонд налічвае 695 тысяч экземпляраў. У ім ёсць такія рэдкасныя кнігі як прыжыццёвыя выданні сачыненняў Л. М. Талстога, А. А. Фета, І. С. Тургенева, А. П. Сумарокава і іншыя. Ёсць «Гісторыя мастацтваў» П. П. Гнедзіча, «Палітыкі» Арыстоцеля. У 1975 годзе фонд бібліятэкі універсітэта папоўніла асабістая бібліятэка прафесара Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта Ірыны Міхайлаўны Бяляўскай, якую яна завяшчала нашаму універсітэту. Бібліятэка штогодна набывае каля 40.000 экземпляраў навуковай і вучэбнай літаратуры, перыядычных выданняў.

Гэтымі багатымі фондамі чытачы могуць карыстацца праз абанементы і чытальныя залы бібліятэкі. Абанемент № 1 (вул. Кірава, 119, ауд. 1—20), тэл. 56-11-30) забяспечвае вучэбнай і навуковай літаратурай студэнтаў матэматычнага, фізічнага, геалагічнага, біялагічнага факультэтаў і факультэта фізічнага выхавання.

Абанемент № 2 (вул. Савецкая, 106, тэл. 56-30-54) збірае ў сваіх фондах мастацкую літаратуру, літаратуру па мастацтву, гісторыі, мовазнаўству і забяспечвае студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта вучэбнай і навуковай літаратурай.

Абанемент № 3 (вул. Савецкая, 104, ауд. 1—3, тэл. 56-12-43) выдае вучэбную і навуковую літаратуру студэнтам эканамічнага факультэта.

Чытальнымі заламі бібліятэкі могуць адначасова карыстацца 250 чалавек. У распараджэнне чытачоў прадастаўляюцца творы класікаў марксізму-ленінізму, даведачная і вучэбная літаратура, часопісы і газеты.

Чытальная зала № 1 (вул. Савецкая, 104, ауд. 2—1) утрымлівае ў сваіх фондах вучэбную літаратуру для студэнтаў эканамічнага і гісторыка-філалагічнага факультэтаў; савецкія і замежныя часопісы і газеты за ўсе гады захоўваюцца ў іх бібліятэцы; кнігі на замежных мовах.

Чытальная зала № 2 (вул. Кірава, 119, ауд. 3—9) абслугоўвае вучэбнай літаратурай студэнтаў матэматычнага, фізічнага, геалагічнага, біялагічнага факультэтаў і факультэта фізічнага выхавання.

Арыентавацца ў фондах бібліятэкі дапамагае чытачам даведачна-бібліяграфічны аддзел (вул. Кірава, 119, аўд. 1—14). Супрацоўнікі аддзела пры дапамозе сістэматычнага і алфавітнага каталогаў, картатэкі газетна-часопісных артыкулаў заўсёды дапамогуць падабраць літаратуру па канкрэтнаму пытанню, знайсці месца захоўвання патрэбнай кнігі ці часопіса, удакладніць назву твора.

У тым выпадку, калі кніга адсутнічае ў фондах бібліятэкі, прыходзіць на дапамогу чытачам міжбібліятэчны абанемент (МБА) (вул. Савецкая, 104, аўд. 3—5, тэл. 56-34-20). Па МБА можна выпісаць неабходную кнігу з іншых бібліятэк рэспублікі і краіны.

Чытачы бібліятэкі могуць карыстацца ўсімі аддзеламі бібліятэкі пры ўмове, што ёсць білет чытача. У кожным аддзеле ёсць правілы карыстання бібліятэкай, у якіх указаны правы і абавязкі чытача.

Бібліятэка імкнецца як мага шырэй пазнаёміць чытачоў з наяўнай літаратурай. З гэтай мэтай арганізуюцца тэматычныя кніжна-ілюстрацыйныя выстаўкі, адкрытыя прагляды, праводзяцца чытальніцкія канферэнцыі, літаратурна-музычныя вечары і інш.

Супрацоўнікі бібліятэкі імкнуцца стварыць найбольш спрыяльныя ўмовы для чытачоў і чакаюць ад іх толькі аднаго — ашчадных адносін да кніг, своечасовага вяртання іх у бібліятэку. Творы вялікіх пісьменнікаў, навуковыя манаграфіі, рэдкія выданні падручнікаў і даведнікі будуць яшчэ доўга дапамагаць чытачам бібліятэкі ў авалоданні ведамі, калі будуць выкананы наступныя правілы:

— перад пачаткам чытання абгарнуць кнігу ці часопіс у паперу;

— не пісаць на лістах ручкай ці алоўкам;

— карыстацца пры чытанні закладкай ці лістком паперы;

— не вырываць з кніг і часопісаў старонкі і ілюстрацыі.

Дарагія першакурснікі, захоўвайце правілы карыстання бібліятэкай, і вы заўсёды будзеце нашымі жаданымі чытачамі!

***Л. ЛІТВІНАВА,***
**старшы метадыст бібліятэкі ГДУ.**

*Спорт*

# ВЫСОКАЕ МАЙСТЭРСТВА

У сярэдзіне верасня на вяслярным канале ў Гомелі адбудуцца спаборніцтвы па веславанню на байдарках і каноэ, якія ўваходзяць у праграму Усесаюзных студэнцкіх гульняў. Днямі ім папярэднічала праведзенае тут жа першынство Белсавета СДСТ «Буравеснік». За ўзнагароды і права прыняць удзел у Гульнях змагаліся весляры студэнцкага таварыства рэспублікі.

Паспяхова выступілі спартсмены нашага універсітэта (трэнеры — У. К. Паўлючкоў і С. П. Сямёнаў). У камандным заліку яны ўпэўнена заваявалі першае месца.

Лік перамогам адкрыла супрацоўніца універсітэта майстар спорту Ганна Котава. Яна хутчэй за ўсіх сапернiц пераадолела 500 м. Яшчэ адну вышэйшую узнагароду ёй уручылі пасля гонак байдарак-двоек. Яе напарніцай была трэцякурсніца факультэта фізвыхавання кандыдат у майстры спорту Людміла Пунтус.

У гонках каноэ-двоек на 500 м прызёрамі спаборніцтваў сталі майстры спорту Аляксандр Манько і Уладзімір Зацэпа.

Дастойны ўклад у скарбонку заліковых ачкоў унёс другакурснік факультэта фізвыхавання кандыдат у майстры спорту Генадзь Мішчук. На байдарцы-адзіночцы ён паказаў другі вынік у гонках на 1000 м і трэці — на дыстанцыі удвая карацейшай.

У гонках каноэ-адзіночак на 500 м другім прызёрам стаў трэцякурснік факультэта фізвыхавання Віталь Васільцоў, а яго таварышу па вучобе Уладзіміру Паўлаўцу дасталася бронзавая ўзнагарода, які дабавіў да яе яшчэ і сярэбраную пасля гонкі на 1000 м.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

*У свеце цікавага*

# І НЯМА КАНЦА ЗАГАДКАМ

Вучоныя раскрылі многія таямніцы жывога і расліннага свету. Але нямала застаецца яшчэ загадкавага і няяснага. Вось некалькі прыкладаў.

Высока ў гарах сустракаецца расліна, якая, перад тым як раскідваць сваё насенне, здольна нейкім чынам растапляць снег вакол сябе, у выніку чаго насенне падае не на снег, а на зямлю. Як гэта адбываецца? За лік чаго яна выдзяляе цяпло?

Вядома, што многія насякомыя часцей за ўсё размяшчаюцца на гарызантальнай паверхні так, што вось іх цела знаходзіцца па лініі ўсход—захад, або поўнач—поўдзень. Дзе знаходзяцца органы, якія дазваляюць насякомым адчуваць зямны магнетызм або электрычнае поле, невядома.

Ёсць такая расліна—архідэя офрыс . Гэта далёкая сваячка трапічных архідэй. Яна вядома не сваёй прыгажосцю, а арыгінальным спосабам апылення. Кветка архідэі знешне падобна на самку дзікай пчалы. Яна ж мае і своеасаблівы пах, і хаця ў кветках няма ніякага нектару, насякомыя самі ляцяць да яе. Варта ім толькі дакрануцца да кветкі, як на галаву «адурманенай» пчале высыпаецца пылок. Насякомае адлятае, але вось на яго шляху зноў знаёмы пах, і яно накіроўваецца туды. Так і адбываецца апыленне.

*Карысныя парады*

# ПАЗБАЎЛЯЙЦЕСЯ ДРЭННАЙ ЗВЫЧКІ

**Курыць — шкодна. Гэта сцвярджаюць і медыкі, і сацыёлагі. У адным з нумароў нашай газеты за мінулы год мы змяшчалі артыкул загадчыка кафедры фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны прафесара А. С. Калугіна аб шкодзе курэння. Сёння па яго рэкамендацыі мы друкуем парады Усесаюзнага кардыялагічнага цэнтра АМН СССР для тых, хто рашыў кінуць курыць.**

—Рэгістрыруйце час, калі вы выкурылі кожную цыгарэту (папяросу) або толькі хацелі закурыць, але стрымаліся. Адзначайце, наколькі моцна вам хацелася ў той момант курыць. Гэта не толькі дапаможа вам максімальна скараціць колькасць выкураных цыгарэт, але і высветліць, калі жаданне курыць найбольш моцнае, выдзеліць самую «важную» цыгарэту дня і ў данай сітуацыі пастарацца сканцэнтраваць усе свае сілы для адмовы ад курэння.

— На асобным лісце паперы складзіце спіс асабістых прычын, якія прымушаюць вас адмовіцца ад дрэннай звычкі. Раніцай і вечарам праглядайце гэты спіс, пры неабходнасці змяняйце і дапаўняйце яго.

— Загадзя вызначце дату, калі вы кінеце курыць. Яна можа быць прымеркавана да водпуску, дня нараджэння, свята або якой-небудзь знамянальнай для вас падзеі. Калі вы выбралі дзень, не шукайце прычын для таго, каб адцягнуць намечанае на больш позні тэрмін. Будзьце паслядоўнымі і рашучымі.

— Трэба вырашыць, ці будзеце вы кідаць курыць адразу (гэта лепш) або паступовa. Калі вы вырашылі кінуць курыць паступовa, вызначце сабе прамежкавыя мэты на шляху да канчатковай адмовы ад курэння.

Напрыклад, кожны дзень выкурваць на 2 цыгарэты менш. Або кінуць курыць праз два тыдні, скарачаючы кожныя 5 дзён колькасць выкураных цыгарэт на трэць.

— Калі вас прымушае да курэння абстаноўка на рабоце, то для адмовы ад курэння выберыце нерабочыя дні (нядзеля, свята, водпуск).

— Аднак, калі вы адчуваеце моцную неабходнасць у курэнні, лепш кідайце курэнне адразу. За дзень або два да канчатковай адмовы ад шкоднай звычкі выкурыце прыкладна ўдвая больш цыгарэт, чым звычайна. Дзякуючы павышанай дозе, адбудзецца перанасычэнне арганізму нікацінам і іншымі шкоднымі рэчывамі, якія ўтрымліваюць тытунь. Вы пры гэтым адчуеце шкоднае ўздзеянне тытуню на свой арганізм і неабходнасць кінуць курыць.

— Не трэба купляць цыгарэты ў вялікай колькасці (блокамі). Пакуль не скончацца цыгарэты ў адным пачку, не купляйце другі. Выпрацоўвайце ў сабе валявыя якасці, якія дапамогуць вам хутчэй кінуць курыць.

— Калі не ўзнікла жаданне закурыць — не даставайце цыгарэту з пачка, не бярыце ў рукі пачак 3—4 мінуты. У гэты час пастарайцеся чым-небудзь сябе заняць. Напрыклад, пазваніце па тэлефоне, прайдзіцеся па пакоі, зайдзіце да суседа, які не курыць і г. д.

— Раніцай, як можна далей, адцягвайце час да закурвання першай цыгарэты.

— Не насіце з сабой цыгарэты, схавайце або аддайце іх каму-небудзь.

— Вызначце гадзіны сутак, калі вы як бы дазваляеце сабе закурыць. Пастарайцеся максімальна скараціць колькасць такіх момантаў.

— Не курыце, калі глядзіце тэлевізар.

— З пакоя прыбярыце попельніцы, запальніцы і ўсе прадметы, якія могуць нагадваць вам пра курэнне.

— Часцей наведвайце тэатры, музеі, спартыўныя залы, дзе курыць забараняецца.

— Пастарайцеся замяніць цыгарэту кароткімі прагулкамі або лёгкімі практыкаваннямі. Але не замяняйце цыгарэту высокакаларыйнай ежай.

— Калі вам прапанавалі закурыць, адказвайце, што ў даны момант вам курыць не хочацца. Але ніколі не аб'яўляйце знаёмым; «Я кінуў курыць».

— Падвядзіце вынік за тыдзень і г. д., колькі вы сэканомілі на цыгарэтах.

Спадзяемся, што гэтыя парады ў значнай ступені дапамогуць вам хутчэй пазбавіцца ад шкоднай звычкі — курэння.

# ВЯСЁЛЫ ПЕРАПЫНАК

## ФРАЗЫ

● Навошта чалавеку такое сумленне, якое яго без канца мучыць?

● Адмовіўся ад шчасця, калі даведаўся, што яно не ў грашах.

● Галоўная яго становучая рыса — не ўмее ўтойваць свае недахопы.

● Столькі развялося аматараў кнігі, што надышоў час выдзеліць сярод іх прафесіяналаў.

● Ну, добра, выйдзеш ты ў людзі! А што ты ім скажаш?

● Калі зусім нічога не ведаеш, адчуваеш сябе больш упэўнена.

● У студэнтаў апетыт з'яўляецца і пасля абеду ў студэнцкай сталовай.

● Як так разлічыць, каб шлюб атрымаўся не па разліку?

● Калі яго спыталі: «Для чаго жывеш?» — пацікавіўся: «А хто пытае?»

● Жыць бы прыпяваючы, ды голасу няма.

● Усе людзі так ці інакш разумныя. Пытанне ў тым, як іменна: так ці інакш.

## НОВЫЯ ПАДРУЧНІКІ І ІХ АЎТАРЫ

«Пад'ёмна - транспартныя прыстасаванні». Калектыў аўтараў (т. **Лебедзь, Рак** і **Шчука**).

⊙

«Асновы геранталогіі». **Кашчэй.**

⊙

«Тэорыя хістання». **Калабок.**

⊙

«Дрэваапрацоўка». **Тата Карла.**

⊙

«Рэжучыя інструменты». **Бармалей.**

⊙

«Гідраўліка». **Садко.**

⊙

«Будаўнічыя нормы і правілы». **Тры парасяці.**

**(«Студенческий меридиан»)**

**ДА ЎВАГІ ЧЫТАЧОЎ!**

**У сувязі са знаходжаннем студэнтаў на сельскагаспадарчых работах наступны нумар нашай газеты выйдзе за 26 верасня г. г.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

АЗ 10112

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета ЛКСМБ и профкома Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 2 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 56-16-52.

Заказ 4798